**ДЭРЭ́ГУС** Міхаіл Гардзеевіч (5.12.1904, в. Вясёлае Харкаўскай вобл., Украіна — 31.7.1997), украінскі жывапісец і графік. Нар. мастак СССР (1963), чл.-кар. АМ СССР (1958). Вучыўся ў Харкаўскім маст. ін-це (1923—30). Сярод твораў: цыклы афортаў «Па дарогах Украіны» (1941), «Па дарогах вайны» (1941—42), «Віртанне» (1943—44), «Украінскія народныя думы і гістарычныя песні» і «Маруся Багуслаўка» (абодва 1947); трыпціх «Дума пра казака Галоту» (1960), цыкл «Стэп» (1970—80-я г.). Аўтар ілюстрацый да твораў І.Катляроўскага, М.Гогаля, Т.Шаўчэнкі, Л.Талстога і інш. Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1969.

*Літ.*: Врона І.М. Дерегус. Київ, 1958; М.Дерегус. Офорты: [Альбом]. Киев, 1971.



М.Дэрэгус. Маруся Багуслаўка. 1947.

**ДЭРЭ́Н** (Derain) Андрэ (10.6.1880, Шату, каля Парыжа — 8.9.1954), французскі мастак. Вучыўся ў Э.Кар'ера (1898—99) і ў акадэміі Жуліяна (1904) у Парыжы. У 1900—07 пісаў пейзажы ў духу фавізму і тэхніцы, блізкай да А.Матыса («Тэмза каля Лонданскага моста», 1900). Каля 1908 стыль Д. змяніўся пад уплывам П.Сезана і ранняга кубізму («Купальшчыцы», 1908, «Від Кадака», 1910). Музейная культура, да якой меў схільнасць Д., абумоўлівала ў яго творах рысы эклектызму і іх падабенства да Г.Курбэ і А.Рэнуара (выявы аголеных), К.Каро і мастакоў барбізонскай школы (пейзажы), Ж.А.Энгра, візант., ісп., венецыянскага жывапісу (партрэты). Рабіў тэатр. дэкарацыі і касцюмы, што ўплывала і на яго жывапісныя работы («П'еро і Арлекін», 1924). Аўтар ілюстрацый у тэхніцы дрэварыту да твораў Г.Апалінэра, А.Брэтона і інш.

*Літ.*: Калитина Н.Н. А.Дерен. М., 1976.

**ДЭСАЛІ́Н** (Dessalines) Жан Жак (20.9.1758, Гана — 17.10.1806), дзеяч нац.-вызв. руху на в-ве Гаіці. Паджыццёвы ген.-губернатар (з 1804). Негр, да 1790 раб (узяў прозвішча свайго б. уладальніка). Удзельнік нац.-вызв. паўстання пад кіраўніцтвам Ф.Д.*Тусэн-Луверцюра*, пасля паланення якога французамі (1802) на чале арміі паўстанцаў (з мая 1803) дамогся вызвалення в-ва ад франц. каланізатараў (канец 1803). З кастр. 1804 імператар Гаіці (правіў як Жак І). Цяжкае эканам. становішча краіны (у т.л. з-за блакады вострава Францыяй, а з 1806 і ЗША), агр. палітыка (перадача дзярж. зямель пераважна ва ўладанне неграм) і жорсткія метады праўлення Д. выклікалі ў кастр. 1806 паўстанне землеўладальнікаў-мулатаў, у час якога Д. загінуў.

**ДЭСА́НТ** (франц. descente літар. спуск, высадка), войскі, спецыяльна падрыхтаваныя для высадкі (выкідання) на тэрыторыю праціўніка або высаджаныя (выкінутыя) на ёй з мэтай вядзення баявых дзеянняў. У залежнасці ад характару пастаўленых задач, глыбіні высадкі і колькаснага складу войск Д. бываюць аператыўна-стратэгічныя, аператыўныя, аператыўна-тактычныя, тактычныя, спец. прызначэння і дэманстратыўныя; паводле сродкаў і спосабаў перакідкі войск — марскія, паветраныя і камбінаваныя. Вылучаюць таксама Д. карабельныя і танкавыя.

Паветраныя Д. бываюць парашутныя (*паветрана-дэсантныя войскі* і тэхніка выкідваюцца з ваенна-транспартных самалётаў на парашутах), пасадачныя (высаджваюцца з самалётаў, верталётаў і планёраў, якія прызямляюцца ў тыле праціўніка) і камбінаваныя. Марскія Д. перавозяцца на спец. дэсантных караблях і трансп. суднах, высаджваюцца на бераг, на захопленыя прычалы або з дапамогай дэсантна-высадкавых сродкаў і верталётаў. Першымі звычайна высаджваюцца часці *марской пяхоты*. *Ф.Р.Каламоец.*

**ДЭ СА́НТЫС** (De Santis) Джузепе (н. 11.2.1917, г. Фонды, Італія), італьянскі кінарэжысёр. Скончыў Рымскі ун-т (1939), вучыўся ў Рымскім кінацэнтры. У яго творчасці неарэалістычныя тэндэнцыі сац. драм «Трагічнае паляванне» (1947), «Горкі рыс» (1949), «Няма міру пад алівамі» (1950) па-мастацку пераканаўча раскрыліся ў фільме «Рым, 11 гадзін» (1952). Сярод інш. фільмаў: «Дайце мужа Ганне Дзакеа» (1953, у пракаце «Страчаныя мроі»), «Яны ішлі на Усход» (1964, сав.-італьян.), «Цэнны спецыяліст з забяспечанай будучыняй» (1972). У лепшых фільмах страснасць, рамантычная прыўзнятасць спалучаюцца з каларытнымі замалёўкамі нар. жыцця.

**ДЭ́САЎ** (Dessau) Пауль (19.12.1894, г. Гамбург, Германія — 28.6.1979), нямецкі кампазітар, дырыжор, скрыпач. Чл. Ням. акадэміі мастацтваў (1950), у 1957—62 яе віцэ-прэзідэнт. З 11 гадоў выступаў як скрыпач-віртуоз. У 1910—12 вучыўся ў кансерваторыі Кліндварта—Шарвенкі (Берлін). З 1912 канцэртмайстар і дырыжор оперных і драм. т-раў у многіх гарадах Германіі. У 1933 эмігрыраваў у Парыж, з 1939 у ЗША. З 1948 у ГДР. Супрацоўнічаў з У.*Дыснеем*, т-рам Б.*Брэхта*, пісаў музыку да яго оперных і драм. спектакляў. У сваіх творах новыя сродкі муз. мовы спалучаў з дакладнай жанравай, структурнай і інтанацыйнай вызначанасцю тэматызму, абумоўленай традыцыямі быт. музыкі. Нац. прэмія ГДР 1953, 1956, 1965, 1974.

*Тв.*: Оперы (паст. ў Берліне) — «Асуджэнне Лукула» (1951), «Пунціла» (1966), «Ланцэлот» (паводле Я.Шварца, 1969), «Эйнштэйн» (1974), «Леонс і Лена» (1979) і інш.; для хору і галасоў з арк. — араторыі «Хагада» (1936), «Нямецкае Мізэрэрэ» (1947); кантаты; для аркестра — 2 сімфоніі (1926, 1962), Варыяцыі на тэму І.С.Баха (1964), Дывертысмент для камернага арк. (1964), «Аркестравая музыка» № 1—4 (1955—73); «Памяці Брэхта» (1957); камерна-інстр. ансамблі, музыка да спектакляў драм. т-ра і кінафільмаў; песні, хары, фп. п'есы і інш.

*Літ.*: Хенненберг Ф. Пауль Дессау: Пер. с нем. М., 1979.

**ДЭСЕЛЕРО́МЕТР** (ад *дэ...* + лац. celero паскараю + *...метр*), прылада для вымярэння запавольвання руху машын і інш. трансп. сродкаў. Дзеянне заснавана на вызначэнні сіл інерцыі маятніка, па адхіленні якога вызначаюць запавольванне (тармазную сілу). Бываюць маятнікавыя, гідраўлічныя і электронныя, індыкатарныя і самазапісвальныя. Маятнікавыя Д. (з маятнікам, падвешаным на восі ў празрыстым корпусе) прымацоўваюцца прысоскамі да ветра-



А.Дэрэн. Тэмза каля Лонданскага моста. 1900.

вога шкла або пярэдняй панэлі аўтамабіля.

**ДЭСЕНСІБІЛІЗА́ЦЫЯ** (ад *дэ...* + *сенсібілізацыя*), пазбаўленне ад празмернай адчувальнасці (гіперадчувальнасці), зменаенай рэактыўнасці ў адказ на ўздзеянне «чужога» антыгену (алергена). Дазваляе адысці ад сенсібілізацыі — імуннай рэакцыі, якая пры паўторных сустрэчах з алергенам суправаджаецца пашкоджаннем або праяўленнем хваробы. Павышаная адчувальнасць да антыгену можа быць неадкладнай, ажыццяўляцца праз 1—30 мін з дапамогай спецыфічных антыцел або запаволенай (праз 24—48 і больш гадз) з дапамогай вызначаных клетак імунітэту. Д. значна зніжае рэагаванне ў адказ на ўздзеянне антыгену. Стан Д. набываецца праз мэтанакіраваныя ўздзеянні алергенам на арганізм з павышанай адчувальнасцю. Гіпасенсібілізуючая тэрапія ажыццяўляецца ўрачом алерголагам пры ўвядзенні ў арганізм пацярпелага малых доз алергена, канцэнтрацыю якога з кожным днём павялічваюць, што садзейнічае выпрацоўцы інш. імуннага адказу, з'яўленню «блакіруючых антыцел», якія блакіруюць антыген і не дазваляюць яму выклікаць алергічную рэакцыю. Д. пры алергічных рэакцыях запаволенага (клетачнага) тыпу дасягаецца знішчэнем прычыны, якая іх правакуе. Дасягнуць Д. ўдаецца рознымі спосабамі, якія забяспечваюць зніжэнне гіперрэактыўнасці ў адказ на ўздзеянне антыгену (алергена). *М.А.Скеп'ян.*

**ДЭСЕ́РТ** (франц. dessert), садавіна, салодкія стравы (кампот, марожанае і інш.), якія падаюцца ў канцы абеду.

**ДЭ СІ́КА** (De Sica) Віторыо (7.7.1902, г. Сора, Італія — 13.11.1974), італьянскі кінаакцёр, рэжысёр. Адзін з заснавальнікаў *неарэалізму*. З 1931 як акцёр здымаўся ў кінакамедыях: «Што за падлюгі гэтыя мужчыны», «Дам мільён», «Пан Макс». Драм. талент выявіўся ў фільме «Генерал Дэла Раверэ». З 1940 выступаў як рэжысёр. Фільмы вылучаюцца высокім майстэрствам, тонкім маст. густам, бездакорнымі акцёрскімі ансамблямі: «Шуша» (1946), «Выкрадальнікі веласіпедаў» (1948, прэмія «Оскар» 1949), «Умберта Д.» і «Цуд у Мілане» (абодва 1951), «Дах» (1956), «Учора, сёння, заўтра» (1963, прэмія «Оскар» 1964), «Шлюб па-італьянску» (1964), «Сланечнікі» (1969, сав.-італьян.), «Сад Фінці-Канціні» (1970, прэмія «Оскар» 1971) і інш. Яго творчасці аднолькава блізкія псіхалагічная глыбіня і высокі драматызм, вострая сатыра і лёгкая, вытанчаная камедыйнасць.

**ДЭСІКА́НТЫ**, хімічныя рэчывы, якія выклікаюць высушванне раслін. Выкарыстоўваюць у выглядзе водных раствораў і эмульсій для дэсікацыі (перадуборачнае высушванне с.-г. раслін), што паскарае паспяванне насення, пладоў, памяншае іх вільготнасць і аблягчае механізаваную ўборку ўраджаю. У якасці Д. звычайна выкарыстоўваюць: рэглон на насенных пасевах морквы, капусты, буракоў, бульбы; раўндап на насенных пасевах гароху, канюшыны, ільнудаўгунцу; хларат магнію $Mg(ClO_3)_2 \times$ $\times\, 6H_2O$, хларат-хларыд кальцыю $[Ca(ClO_3)_2$ у сумесі з $CaCl_2]$ на пасевах бавоўніку, пшаніцы, бульбы, цукр. буракоў і інш. *В.П.Дзеева.*

**ДЭСІКА́ЦЫЯ** (ад лац. desicco высушваю), перадуборачнае падсушванне раслін для паскарэння выспявання і аблягчэння ўборкі ўраджаю. Для Д. выкарыстоўваюць хім. рэчывы — *дэсіканты*, якія разбураюць калоіды пратаплазмы, што рэзка зніжае здольнасць клетак утрымліваць ваду, памяншае колькасць звязанай вады ў расліне і ўзмацняе выпарэнне. Выкарыстоўваюць на пасевах бавоўніку, канапель, сланечніку, рысу, пшаніцы, бульбы, насеннікаў цукр. буракоў і інш.; эфектыўная ў вільготнае надвор'е.

**ДЭСКВАМА́ЦЫЯ** (ад лац. desquamo выдаляю луску), л у ш ч э н н е, адслойванне горных парод у выглядзе тонкай акругла-выпуклай лускі (1—2 см). Адбываецца на скалістай паверхні пад уплывам рэзкага вагання т-р (у асн. сутачных). Характэрна ў пустынях і высакагорных раёнах, дзе больш інтэнсіўныя працэсы фізічнага выветрывання.

**ДЭСКРЫ́ПТАР** (познлац. descriptor ад describo апісваю), лексічная адзінка (слова ці словазлучэнне) інфарм.-пошукавай мовы ў ЭВМ. Апісвае асн. сэнсавы змест дакументаў, структуру даных або праграму; служыць таксама для фармулявання інфарм. запыту пры пошуку дакументаў у інфарм.-пошукавай сістэме (гл. *Інфармацыйны пошук*). У якасці Д. можна выбраць любое (звычайна найб. характэрнае) ключавое слова (групу слоў) ці лічбавы код. Мнагазначным словам адпавядае некалькі Д., сінонімам — адзін Д.

**ДЭСКРЫПТЫ́ЎНАЯ ЛІНГВІ́СТЫКА**, адзін з трох кірункаў класічнага *структуралізму* (поруч з Пражскім лінгвістычным гуртком і *глассематыкай*), што існаваў у 1-й пал. 20 ст. ў ЗША. Меў на мэце распрацаваць строгія фармальныя працэдуры апісання мовы: сфармуляваць кампактныя, несупярэчлівыя і вычарпальныя правілы, з дапамогай якіх у мове паслядоўна вылучаюцца на розных яе ўзроўнях (фаналагічным, марфалагічным, сінтаксічным) адзінкі, класы адзінак, а таксама вызначаюцца сувязі паміж адзінкамі розных узроўняў мовы і паміж адзінкамі аднаго класа. Для выканання гэтых задач у Д.л. распрацаваны 3 прыёмы навук. даследавання мовы: а н а л і з п а н е п а с р э д н а с а с т а ў л я ю ч ы х, т р а н с ф а р м а ц ы й н ы м е т а д і гал. спосаб апісання мовы — д ы с т р ы б у т ы ў н ы м е т а д. Напачатку першыя 2 прыёмы былі скіраваныя на выдзяленне адзінак і на правілы іх камбінавання, а дыстрыбутыўны метад — на выяўленне характару размеркавання адзінак у тэксце; т.ч. браўся пад увагу толькі план выражэння моўных адзінак (іх знешні, фармальны бок) і не разглядаўся іх план зместу (семантычны бок). Зараз выкарыстанне гэтых метадаў абапіраецца і на ўлік семантычных асаблівасцей мовы. Ад Д.л. бяруць пачатак некалькі школ: І е л ь с к а я (засн. Л.Блумфілдам), звязаная пераважна з фармалізацыяй апісання мовы; Э н - А р б а р с к а я побач з фармальнымі працэдурамі аналізу ўлічвае і псіхал. фактары ў мове (Ю.Найда, К.Пайк і інш.); г е н е р а т ы ў н а я л і н г в і с т ы к а даследуе звязны тэкст з дапамогай трансфармацыйнага аналізу і матэм. метадаў (Н.Хомскі і інш.).

*Літ.:* Г л и с о н Г. Введение в дескриптивную лингвистику: Пер. с англ. М., 1959. *Б.А.Плотнікаў.*

**ДЭСМАГЕ́Н**, тое, што *пракамбій*.

**ДЭСМУРГІ́Я** (ад грэч. desmos сувязь, павязка + ergon справа), вучэнне аб павязках і метадах іх накладання пры пашкоджаннях і хваробах.

**ДЭСО́РБЦЫЯ** (ад *дэ...* + *сорбцыя*), выдаленне з вадкасцей ці цвёрдых цел рэчываў, якія яны паглынулі пры *абсорбцыі* і *адсорбцыі*; працэс, адваротны адсорбцыі. Д. робяць награваннем адсарбенту, зніжэннем ціску над ім, апрацоўкай яго растваральнікамі. Выкарыстоўваюць у прам-сці для рэгенерацыі гетэрагенных каталізатараў, атрымання розных рэчываў (пры рэкуперацыі).

**ДЭСПАТЫ́ЗМ** (ад грэч. despoteia неабмежаваная ўлада), форма неабмежаванай, абсалютнай, самадзяржаўнай улады, для якой уласціва поўнае самавольства, самаўпраўства, грубае і жорсткае падаўленне волі падданых і іх бяспраўе. Д. асабліва характэрны для абсалютных манархій (гл. таксама *Дэспатыя*).

**ДЭСПАТЫ́Я**, тое, што *дэспатызм*, адна з форм *дыктатуры*. Была пашырана ў стараж.-ўсх. (Асірыя, Вавілонія, Егіпет, Індыя, Іран, Кітай і інш.) і сярэдневяковых краінах — Багдадскім (Абасідаў) халіфаце (8—9 ст.), Візант. імперыі (да 12 ст.), Асманскай імперыі (14—16 ст.), дзяржаве Вялікіх Маголаў у Індыі (16—17 ст.) і інш. У цяперашні час у пераносным сэнсе ўжываецца вытворнае ад Д. слова «дэспат», якім пазначаюць самаўладнага, бязлітаснага чалавека, які не лічыцца ні з чыімі думкамі і жаданнямі.

**ДЭСП'Ё** (Despiau) Шарль (4.11.1874, г. Мон-дэ-Марсан, Францыя — 28.10.1946), французскі скульптар; майстар партрэта. Вучыўся ў Парыжы ў Школе дэкар. мастацтваў і ў Школе прыгожых мастацтваў (з 1891). У 1907—14 памочнік А.*Радэна*. Творы адметныя паэтычнасцю вобразаў, тонкасцю мадэ-